**В.Э. БАРАНАВА**
Навуковы кіраўнік – К.А. Зайцава
Рэспубліка Беларусь, Віцебск, Ліцэй ВДУ імя П.М. Машэрава

# МІФАЛАГІЧНЫЯ ВОБРАЗЫ Ў КНІЗЕ ЯНА БАРШЧЭЎСКАГА “ШЛЯХЦІЧ ЗАВАЛЬНЯ, АБО БЕЛАРУСЬ У ФАНТАСТЫЧНЫХ АПАВЯДАННЯХ”

**Уводзіны.** Выдатным геніем магічных метамарфоз з’яўляецца Ян Баршчэўскі. Вядомы беларускі, польскі пісьменнік, прадстаўнік беларускага рамантызму, адзін з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры, чалавек, які здолеў, абапіраючыся на беларускую нацыянальную культуру, паказаць жыццё свайго краю, яго гісторыю і традыцыі, што ўяўляе сабой вялікую цікавасць і актуальнасць. Па-майстэрску створаныя міфалагічныя вобразы ў кнізе “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”, якую параўноўваюць з сусветна вядомым казачным эпасам “Тысяча і адна ноч”, і сёння даволі актыўна даследуюцца літаратуразнаўцамі (В. Бароўка, А. Крыклівец, Т. Шамякіна), натхняюць сучасных пісьменнікаў на стварэнне новых твораў міфалагічнай тэматыкі (Л. Рублеўская, В. Іпатава).

Актуальнасць навуковага даследавання матывавана неабходнасцю больш шырокага вывучэння фальклорна-міфалагічных традыцый ў прозе беларускіх пісьменнікаў, а таксама папулярызацыяй малой Радзімы – аўтар працы, як і сам Ян Баршчэўскі, з’яўляецца ўраджэнкай Расоншчыны, месца, якое неаднаразова ўзгадваецца ў фантастычных апавяданнях пісьменніка.

Аб’ектам даследавання ў працы выступае творчая спадчына Яна Баршчэўскага. Прадмет даследавання – генезіс, мастацкія тэндэнцыі, міфалагічныя вобразы ў кнізе Яна Баршчэўскага “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”.

Мэта даследавання – на прыкладзе кнігі Яна Баршчэўскага “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” раскрыць пісьменніцкую трактоўку міфалагічных вобразаў.

Дасягненне пастаўленай мэты патрабуе вырашэння наступных задач:

1; выявіць міфалагічныя вобразы ў кнізе Яна Баршчэўскага “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”;

2; раскласіфікаваць дадзеныя міфалагемы ў залежнасці ад прыроды іх паходжання;

3; параўнаць аўтарскія вобразы з энцыклапедычнымі дадзенымі ў галіне міфалогіі.

Матэрыялам даследавання з’яўляецца зборнік апавяданняў Яна Баршчэўскага “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных

апавяданнях”. Метады даследавання – метад сістэмнага аналізу, апісальны і супастаўляльны.

**Асноўная частка**. У кнізе Яна Баршчэўскага “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” на аснове сістэмнага аналізу намі былі вылучаны дзве групы міфалагічных вобразаў:

**1;** Міфалагемы, увасобленыя ў вобразах жывёльнага і расліннага свету.

**2;** Міфалагічныя вобразы, звязаныя з міфамі і легендамі.

Жанр твораў кнігі “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” вызначаецца як фантастычныя апавяданні. Тэрмін ‘фантастыка’ паходзіць ад грэчаскага phantastice – здольнасць уяўляць [1, с.156]. Да фантастыкі адносяцца вобразы, падзеі, абставіны, абмаляваныя ў творах, але немагчымыя ў жыцці. Менавіта з такімі вобразамі мы сустракаемся на старонках апавяданняў Яна Баршчэўскага: цмокі, ваўкалакі, д’яблы, русалкі, вогненныя духі і многія іншыя істоты становяцца дзеючымі асобамі разам са звычайнымі людзьмі. З дапамогай містыкі аўтар прымушае звярнуць увагу на вечныя пытанні дабра і зла.

У сваіх апавяданнях Ян Баршчэўскі выкарыстоўвае вялікую колькасць міфалагічных сімвалаў, звязаных з раслінным і жывёльным светам. Аўтар надае аб’ектам прыроды магічныя ўласцівасці, напрыклад, вобраз травы сустракаецца ў аднайменным апавяданні “Жабер-трава” – “ясная, як зорка, свеціцца над вадою жабер-трава … расце ў воднай глыбіні, засцерагае ад пажараў і вучыць згадваць будучыню” [2, с.228]. Акрамя жабер-травы, у творы сустракаем разрыў-траву, пералёт-траву. Асаблівую ролю ў кнізе Яна Баршчэўскага “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” адыгрываюць міфалагічныя вобразы жывёл, што валодаюць сімволікай і глыбокай культурнай значнасцю. У творы аўтар звяртаецца да вобразаў жывёл, якія выходзяць за межы апісанняў звычайных істот.

Кот Варгін у апавяданні ўвасабляе вобраз незвычайнай хатняй жывёлы. Ён зачароўвае чалавека і прымушае ўзяць яго да сябе ў дом, а потым выклікае ў гаспадара вар'яцтва і прымушае яго сварыцца з блізкімі. Ад буркатання Варгіна ў галаве чалавека заводзяцца восы, матылі і іншыя казуркі: “Поўсць блішчастая, увесь чорны, як вуголь, вочы гараць. Да усіх ласкавы. Але тыя, хто бавіліся з катом праз нейкі час пачалі хварэць. Бо кот сваім нячыстым варкатаннем распладзіў у галаве гаспадара, як у гняздзе, атрутных восаў. Пра яго гаварылі, што кот, асабліва чорны, мае атруту” [2, с.259]. Адмоўная канатацыя існуе і ў міфалогіі славян: чорны кот сімвалізуе няшчасце, кажуць, што не пашанцуе таму, каму чорны кот пяройдзе дарогу. Таму даволі часта сустрэчы з чорным катом успрымаюцца як знак наўдачы.

Вобразы сабак Стаўры і Гаўры атаясамліваюцца ў творы з адносінамі адданасці паміж гаспадаром і жывёламі. У адным маёнтку жыў князь Бой, што выславіўся на Белай Русі, як магутны асілак. Ён княжыў над усім лю-

дам з гэтых дзікіх краёў на берагах Дрысы. Яго звычайнай забаваю было паляванне з лукам і стрэламі ў пушчах на ласёў і іншых дзікіх звяроў. Так апісвае аўтар сабак Стаўры і Гаўры: “Былі яны надзвычай дужыя і кемныя; найстрашнейшы мядзведзь у сутычцы з ім не мог вытрываць; яго адразу ж разрывалі, як харты зайца. Калі Бой на ловах адыходзіў ад сяброў і акружалі яго ліхадзеі, дык ён разганяў і забіваў іх, пускаючы сваіх дужых сабак. Не раз, калі заблукае ў далекіх лясах, сабакі, ідучы наперад, выводзілі яго на дарогу і да самага дому. Шмат разоў гэтыя сабакі ратавалі гаспадара ад небяспекі і былі найпрыемнейшаю забаваю ў яго жыцці” [2, с.89]. Атрымалася так, што пасля смерці сабак, каб ушанаваць памяць пра іх, гаспадар прызначыў ім святыя дні. Акрамя вобразаў лоўчых сабак, у апавяданнях сустракаюцца вобразы чорнага сабакі з адмоўнай канатацыяй, у творы ён выглядае містычным “з чорнымі вачыма” і небяспечным.

У славянскай літаратуры вобраз змей часта асацыюецца з адмоўнымі якасцямі, такімі як хітрасць, падступства, зло і спакуса. У кнізе Яна Баршчэўскага “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” міфалагемы змей (вужы, гадзюкі) з’яўляюцца ў розных сцэнах, ствараючы атмасферу небяспечнасці, спакусы і здрады (“Вужыная карона”, “Вогненныя духі”). Можна сказаць, што аўтар, уводзячы ў твор жывёльныя і раслінныя міфалагемы, узбагачае сюжэтна-вобразны свет твора, захоўваючы пры гэтым філасофска-дыдактычную функцыю.

Шматлікія даследчыкі творчасці Яна Баршчэўскага (М. Хаўстовіч, М.С. Чарнова, Т.І. Шамякіна) падкрэсліваюць фальклорны характар дадзенага твора, звяртаючы ўвагу на тое, як па-майстэрску аўтар унёс у апісанне жыцця беларусаў фальклорныя вобразы і матывы. Лесуны, ваўкалакі, русалкі, цмокі, ведзьмы становяцца паўнавартаснымі дзеючымі асобамі разам з сялянамі, панамі. Сярод такіх вобразаў цэнтральнымі нам уяўляюцца вобразы Плачкі і Белай Сарокі. Плачка – гэта вобраз, у якім міфалагічныя рысы цесна пераплятаюцца з хрысціянскімі. Як лічаць даследчыкі, з аднаго боку, вобраз Плачкі блізкі да хрысціянскага вобраза, калі плача Багародзіца, з другога — фальклорнаму персанажу, такім як купалка (дух памерлага продка ў жаночым увасабленні): “Кабета тая незвычайна прыгожая. Вопратка яе – белая, як снег, на галаве – чорны убор, і чорная хустка накінута на плечы. Твар хоць і смуглы ад сонца і ветру, але гожы і паглядны, вочы жывыя, і заўсёды блішчаць на іх слёзы. Яна з’яўляецца найчасцей у пакінутых дамах, у пустых касцёлах і на руінах. Бачылі яе таксама пад дрэвамі або пасярод поля. Пасля захаду сонца яна сядае на камяні, наракае на лёс жаласным голасам і заліваецца слязьмі. Кажуць, тыя, хто набліжаўся да яе, чулі такія словы: "Няма каму даверыць таямніцу сэрца майго!” [2, с.125]. У аднайменным апавяданні пісьменнікам выкрываюцца такія чалавечыя заганы, як прагнасць, сквапнасць. Многія персанажы твора ўспрымаюць Плачку як правадыра

да багацця, да зачараванага скарба. Калі маладыя сяляне замест скарба знайшлі скілеты ў кайданах, яны пачулі голас волата: “Нікчэмныя людзі! Золату і срэбру прадалі вы свае душы. Думаючы пра багацце, вы зняважылі прах Героя, які слаўна скончыў тут сваё жыцце!”. Сам Баршчэўскі раз за разам паказвае, што такая трактоўка ладу няправільная, бо любая спроба пошуку скарбу заканчваецца правалам. Вобраз Плачкі ўзмацняе праблему захавання памяці. Паводле легенды, слёзы жанчыны ператварыліся ў крыніцу, а сама Плачка з’яўляецца ў вобразе сялянскай сіраты. На нашу думку, вобраз Плачкі з’яўляецца тыпова беларускім. Паводле паданняў, жанчына з’яўляецца на месцах знакамітых бітваў, на могілках, дзе пахаваны славутыя героі, і, як маці аплаквае сваіх сыноў, так і Плачка тужыць па загінулых.

Антыподам вобраза Плачкі ў кнізе Яна Баршчэўскага выступае Белая Сарока. Белая Сарока – істота дэманічная, жанчына-птушка, якая валодае прывабнай знешнасцю “яе твар – цуд прыгажосці, постаць высокая, велічная; адзенне з дарагіх дыяментаў і перлаў, жыве ў палацы, якога ты яшчэ ніколі не бачыў, ёй кланяюцца багатыя паны і мудрыя галовы, духі па яе загадзе здабываюць скарбы з зямлі і мора, дзікіх мядзведзяў прывучыла да сябе, і тыя, як пакорлівыя сабакі, засёды гатовыя ей служыць. Словам, яна мацейшая за ўсіх чарнакніжнікаў. Толькі часам убіраецца ў пёры белай птушкі, калі хоча бачыць тых, хто спрыяе ёй; і іх узнагароджвае, узбагачае, робіць шчаслівымі” [2, с.183]. У беларускім фальклоры сарока з’яўляецца сімвалам вестак, па народных павер’ях, адзінокая сарока – прадвеснік непрыемнасцяў. На нашу думку, Ян Баршчэўскі таксама ўключыў гэты сэнс у вобраз Белай Сарокі. У апавяданні “Апавяданне восьмае. Белая сарока” гэты персанаж удзельнічае і ў абрадах вядзьмарак. Ад яе ўчынкаў пакутвалі бедныя сяляне, якія здолелі выкрыць цёмныя справы вяртлявай гаспадыні, нарэшце, дабро перамагло зло.

Адным з яркіх вобразаў у беларускай міфалогіі з’яўляецца вобраз ваўкалака або пярэваратня. Паводле энцыклапедыі Беларускі фальклор, ваўкалак – гэта чалавек, ператвораны ў ваўка па сваёй волі або міжволі. Паводле ўяўленняў беларусаў, ператварэнне можа адбыцца па сваёй волі з пэўнымі эгаістычнымі мэтамі чалавека-чараўніка і па яго чарах, скіраваных на аднаго чалавека або групу людзей. Чалавек можа выпадкова трапіць на закляцце, нават сваё, і стаць ваўкалакам [3, с.237]. Беларускі даследчык А. Ненадавец схільны схільны разглядаць ваўкалацтва як спецыфічна беларускую з’яву. З’ява парэваратніцтва апісана Янам Баршчэўскім ў апавяданні “Ваўкалак”. Твор пачынаецца прыездам да шляхціца Завальні пана Марагоўскага, які расказвае пра сустрэчу з ваўкамі па дарозе да маёнтка. Калі пан хацеў стрэліць у драпежнікаў, то яго прыпыніў фурман, які сказаў: “Не страляй, пане, бо ў іх душы чалавечыя. Калі заб’еш якога, дык душа ягоная пойдзе ў пекла,

не адпакутаваўшы за грахі". [2, с.61]. У апавяданні расказваецца пра селяніна Марка, які не па сваёй волі ператварыўся ў ваўкалака. Апынуўшыся ў вопратцы драпежніка, у героя аповеду прачнулася нянавісць да людзей, з гэтай прычыны ён пачаў шкодзіць. З цягам часу герой зразумеў, пашкадаваў аб сваіх учынках і выправіўся, ператварыўшыся зноў у чалавека. Змест дадзенага апавядання носіць дыдактычны характар, аўтар паказвае, што служэнне д'ябальскім сілам нясе за сабой пакаранне.

Акрамя таго, што метамарфозы маглі здарыцца між волі чалавека, у кнізе Яна Баршчэўскага "Шляхціц Завальня,або Беларусь у фантастычных апавяданнях" апісваюцца вобразы, ў якія героі трансфармуюцца свядома – ведзьмы, чараўнікі. Ведзьма або чараўніца – адзін з галоўных персанажаў беларускай дэманалогіі; жаночае ўвасабленне нячыстай сілы. Паводле вераванняў, ведзьма жыве сярод людзей, але яна вылучаецца асаблівасцю паводзін і знешняга выгляду. Лічылася, што ў ведзьмы незвычайны змрочны выраз твару, бліскучыя вочы, кудлатая галава, павольны хрыпаваты голас, асаблівая маўклівасць ці няспынная буркатлівасць, незвычайная хада. Ведзьмы не здольны спачуваць чужому гору і не дзяліцца сваім, вядома, што гэтыя істоты не вераць у Бога і пазбягаюць царквы. Ведзьма-жанчына мае добрыя здольнасці перакідвацца ў розныя істоты. Ян Баршчэўскі ў поўным аб'ёме адлюстраваў вобраз ведзьмы ў сваёй кнізе. У апавяданні "Захаватыя ўчынкі" чараўніца Арына мела здольнасці параўтварацца ў сароку, каб забіраць малако ў кароў.

Вялікай культурнай значнасцю надзелены вобраз русалкі, які з'яўляецца неад'емнай часткай славянскай міфалогіі. Паводле звестак, гэта "міфалагічны персанаж антрапа-, заа-, або тэратаморфнага аблічча. Для ўсіх рэгіёнаў Беларусі характэрна ўяўленне пра русалак, якія паказваліся ў полі, лесе, ля вады ў выглядзе маладых прыгожых дзяўчат у вяночках, з русымі, белымі, зялёнымі ці інш. колеру валасамі, падобнымі на пасмачкі тонкай асакі, водарасці, з зялёнымі ці блакітнымі вачамі, аголеных або апранутых у белае адзенне, галінкі, зелень. Русалкі з'яўляюцца ў час касавання раслін, налівання збажыны, росту дрэў і траў, знікаюць па заканчэнні іх актыўнай вегетацыі – увосень, зімой. Раслінныя локусы разумеюцца пры гэтым не толькі як месцы, дзе можна сустрэць русалак, дзе яны жывуць. Праяўленне жыццядзейнасці міфалагічных істот і раслін ідэнтыфікуецца. Так, у павер'ях і былічках красаванне збажыны асэнсоўваецца як красаванне русалак або як перадача русалкам прыгожымі дзяўчатамі сваёй красы расліннасці; валасы ў міфалагічных істот у жыце – "пад колер жыта"; хваляванне збажыны асацыіруецца з рухамі русалак, а яго шапаценне – з іх гаворкай. Спеў, ваджэнне карагодаў, танцы, піраванні, гранне русалак у збажыне накіравана на абераганне палёў, садзейнічае квітненню і ўраджаю" [3, с.445].

Апісанне класічнага вобраза русалкі цалкам супадае з вобразам баршчэўскай русалкі, якая ўзгадваецца ў “Нарысе Паўночнай Беларусі”: “Русалкі, калі жыта красуе ў полі, з распушчанымі доўгімі валасамі гушкаюцца на бярозах і спяваюць песні; іхні смех адгукаецца ў глыбіні лясоў і трывогай працінае тых, хто збірае грыбы або ягады” [2, с. 16]. На нашу думку, увядзеннем такіх маляўнічых вобразаў у твор аўтар хацеў падкрэсліць прыгажосць беларускай прыроды, багацце народных традыцый і вераванняў.

**Заключэнне.** Такім чынам, у даследаваным творы пераважную колькасць займаюць міфалагічныя вобразы, матываваныя сувяззю з легендамі і паданнямі – ваўкалакі, русалкі, ведзьмы, духі, Плачка і інш. У дадзеных вобразах аўтар увасобіў як станоўчыя, так і адмоўныя рысы чалавека, паказаў на прыкладзе учынкаў герояў, што зло не застаецца незаўважаным.

Праз міфалагемы прыроды аўтар выказвае замілаванне роднай прыродай, яе прыгажосцю і ўнікальнасцю, заклікае да беражлівых адносін да яе, звяртае ўвагу на маральна-этычнае выхаванне, патрыятызм, любоў і павагу да сваіх продкаў і радзімы.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Лазарук М.А., Ленсу А.Я. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў. – Мн. : Нар. Асв, 1996. – 176 с.
2. Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўскі . – М. : Маст. літ. , 1990. – 383 с.
3. Беларускі фальклор: Энцыклапедыя: у 2 т. Т. 1 – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2005. – 765 с.

**М.А. БИРЮКОВ**
Научный руководитель – С.Э. Латышев
Республика Беларусь, Витебск, Лицей ВГУ имени П. М. Машерова

## ЧУЖЕРОДНЫЕ ВИДЫ РАСТЕНИЙ НА ТЕРРИТОРИИ РЕКРЕАЦИОННЫХ ЗОН Г. ВИТЕБСКА

**Введение.** В настоящее время практически все экосистемы нашей планеты в той или иной степени затронуты прямым или косвенным антропогенным воздействием. Хозяйственная деятельность человека стала фактором, определяющим динамику живой природы на всех материках, влияющим на состав биоты, ее расселение, связи, эволюцию видов и сообществ.

Значительную часть флоры Белорусского Поозерья составляют виды, появление в составе данной флоры и расселение которых, прямо или косвенно связано с хозяйственной деятельностью человека. Эти виды, наряду с аборигенными видами, выходцами из природных растительных сообществ образуют своеобразные, не имеющие аналогов в природной обстановке, растительные группировки, встречающиеся у жилья, вдоль дорог, на